ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1982
18
ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 33 (1371)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.



## Ад Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Савета Міністраў СССР

**Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР і Савет Міністраў СССР з глыбокім смуткам паведамляюць партыі і ўсяму савецкаму народу, што 10 лістапада 1982 года ў 8 гадзін 30 мінут раніцы раптоўна памёр Генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Леанід Ільіч БРЭЖНЕЎ.**

**Імя Леаніда Ільіча Брэжнева — вернага прадаўжальніка вялікай ленінскай справы, палымянага змагара за мір і камунізм — будзе заўсёды жыць у сэрцах савецкіх людзей і ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва.**

## ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ аб Пленуме Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

**12 лістапада 1982 года адбыўся нечарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.**

**Па даручэнню Палітбюро ЦК Пленум адкрыў і выступіў з прамовай член Палітбюро ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС тав. Андропаў Ю. У.**

**У сувязі са смерцю Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева члены Пленума ЦК ушанавалі памяць Леаніда Ільіча Брэжнева мінутай журботнага маўчання.**

**Пленум ЦК адзначыў, што Камуністычная партыя, савецкі народ, усё прагрэсіўнае чалавецтва панеслі цяжкую страту. Абарвалася жыццё выдатнага дзеяча Камуністычнай партыі, Савецкай дзяржавы, міжнароднага камуністычнага, рабочага і нацыянальна-вызваленчага руху, палымянага змагара за мір.**

**Леанід Ільіч Брэжнеў, знаходзячыся ў радах ленінскай Камуністычнай партыі больш як 50 гадоў, з іх 18 гадоў на пасадзе яе кіраўніка, унёс велізарны ўклад ва ўмацаванне маналітнасці яе радоў, палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і абароннай магутнасці Савецкага Саюза.**

**Удзельнікі Пленума ЦК выказалі глыбокае спачуванне родным і блізкім памёршага.**

**Пленум ЦК разгледзеў пытанне аб выбранні Генеральнага сакратара ЦК КПСС.**

**Па даручэнню Палітбюро ЦК выступіў з прамовай член Палітбюро ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС тав. Чарненка К. У. Ён унёс прапанову выбраць Генеральным сакратаром ЦК КПСС тав. Андропава Ю. У.**

**Генеральным сакратаром Цэнтральнага Камітэта КПСС Пленум аднагалосна выбраў тав. Андропава Юрыя Уладзіміравіча.**

**Затым на Пленуме выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС тав. Андропаў Ю. У. Ён выказаў сардэчную падзяку Пленуму ЦК за аказанае высокае давер'е — выбранне яго на пасаду Генеральнага сакратара ЦК КПСС.**

**Тав. Андропаў Ю. У. запэўніў Цэнтральны Камітэт КПСС, Камуністычную партыю, што прыкладзе ўсе свае сілы, веды і жыццёвы вопыт для паспяховага выканання вызначанай у рашэннях XXVI з'езда КПСС праграмы камуністычнага будаўніцтва, забеспячэння пераемнасці ў вырашэнні задач далейшага ўмацавання эканамічнай і абароннай магутнасці СССР, павышэння дабрабыту савецкага народа, умацавання міру, у ажыццяўленні ўсёй ленінскай унутранай і знешняй палітыкі, якая праводзілася пры Л. І. Брэжневе.**

**На гэтым Пленум закончыў сваю работу.**



## Юрый Уладзіміравіч АНДРОПАЎ

Юрый Уладзіміравіч Андропаў нарадзіўся 15 чэрвеня 1914 г. у сям'і чыгуначніка на ст. Нагуцкая Стаўрапольскага краю. Адукацыя вышэйшая. Член КПСС з 1939 г.

Шаснаццацігадовым камсамольцам Ю. У. Андропаў быў рабочым у г. Маздок Паўночна-Асецінскай АССР. Затым яго працоўная біяграфія працягвалася на суднах Волжскага параходства, дзе ён працаваў матросам.

З 1936 г. Ю. У. Андропаў—на камсамольскай рабоце. Ён быў выбран вызваленым сакратаром камсамольскай арганізацыі тэхнікума воднага транспарту ў г. Рыбінску Яраслаўскай вобласці. У хуткім часе яго вылучылі на пасаду камсорга ЦК ВЛКСМ суднаверфі імя Валадарскага ў г. Рыбінску. У 1938 годзе камсамольцы Яраслаўскай вобласці выбіраюць Ю. У. Андропава першым сакратаром Яраслаўскага абкома ВЛКСМ. У 1940 годзе Ю. У. Андропаў выбіраецца першым сакратаром ЦК ЛКСМ Карэліі.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Ю. У. Андропаў — актыўны ўдзельнік партызанскага руху ў Карэліі. Пасля вызвалення у 1944 годзе горада Петразаводска ад фашысцкіх захопнікаў Ю. У. Андропаў — на партыйнай рабоце. Ён выбіраецца другім сакратаром Петразаводскага гаркома партыі, а ў 1947 годзе — другім сакратаром ЦК Кампартыі Карэліі.

У 1951 годзе Ю. У. Андропаў па рашэнню ЦК КПСС пераводзіцца ў апарат ЦК КПСС і назначаецца інспектарам, а затым загадчыкам пададдзела ЦК КПСС.

У 1953 годзе партыя накіроўвае Ю. У. Андропава на дыпламатычную работу. Некалькі гадоў ён з'яўляўся Надзвычайным і Паўнамоцным Пaслом СССР у ВНР.

У 1957 годзе Ю. У. Андропаў быў назначаны загадчыкам аддзела ЦК КПСС.

На XXII і наступных з'ездах партыі Ю. У. Андропаў выбіраецца членам Цэнтральнага Камітэта КПСС.

У 1962 годзе Ю. У. Андропаў выбіраецца сакратаром ЦК КПСС.

У маі 1967 года Ю. У. Андропаў назначаецца старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі пры Савеце Міністраў СССР. У чэрвені таго ж года ён выбран кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС. У маі 1982 года Ю. У. Андропаў быў выбран сакратаром ЦК КПСС. З красавіка 1973 года Ю. У. Андропаў — член Палітбюро ЦК КПСС. Юрый Уладзіміравіч Андропаў — дэпутат Вярхоўнага Савета СССР рада скліканняў.

За вялікія заслугі перад Радзімай Ю. У. Андропаву — вядомаму дзеячу Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы — у 1974 годзе прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Ён узнагароджан чатырма ордэнамі Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонага Сцяга, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі.

### НАВУКА Ў РАБОЧЫМ СТРАІ

# МАЛЫШЫ ЗАМЕСТ ГІГАНТАЎ

ПАЧНУ З ПРЫКЛАДУ. Нялёгкая праца геолагаў. Суровае бездарожжа, спякота і холад, бязлікія ўзоры парод — з іх можна было б скласці вялікую гару. Самалётамі дастаўляюцца гэтыя ўзоры за тысячы кіламетраў у лабараторыі, дзе большасць з іх аказваюцца «пустымі», у іх не ўтрымліваюцца рэчывы, якія цікавяць геолагаў. Але аб гэтым можна даведацца толькі ў лабараторыі шляхам раней — хімічнага, зараз — спектральнага аналізу на спецыяльных устаноўках. Што яны сабой уяўляюць?

Мы амаль на кожным кроку сутыкаемся з рознага роду хвалевымі працэсамі: ад механічных ваганняў цвёрдых, вадкіх і газападобных цел да электрамагнітных ваганняў у выглядзе радыёхваль, святла і, нарэшце, хвалевых працэсаў, якія адбываюцца ўнутры атамаў і ядраў. Бесперапыннае рэзананснае паглынанне і выпраменьванне электрамагнітных хваль матэрыяльнымі прадметамі — звычайная з'ява ў прыродзе.

У дыяпазоне радыёхваль гэтая з'ява пастаўлена на службу навуцы з адкрыццём электроннага парамагнітнага рэзанансу (ЭПР). Прыярытэт адкрыцця належыць СССР (Е. К. Завойскі, 1944 г.). Рэчыва, якое валодае натуральным ці індукцыйным магнетызмам, змешчанае ў пастаяннае магнітнае поле і абпраменненае электрамагнітным выпраменьваннем, здольна выбарачна паглынаць энергію электрамагнітнага поля толькі пэўных частот, «малюючы» толькі яму ўласцівую спектральную карціну.

Свой характэрны спектр ЭПР маюць звычайны пясок, вугаль, нафта, лісце раслін і многае іншае. Гэтая асаблівасць і лягла ў аснову стварэння радыёспектрометра ЭПР, які «адгукваецца» на паглынанне энергіі вертыкальнай лініяй пэўнай формы, што ўзнікае на экране індыкатара. Сукупнасць такіх ліній і складае спектр паглынання, характэрны для кожнага рэчыва. Геолагі ўстаўляюць ампулу з пробай у прыладу і па спектрах вызначаюць яе састаў. Мне давялося ўбачыць такі спектрометр, і я здзівілася яго памерам: гэткая чыгунная гара аб'ёмам з невялікі пакой і вагой ад трох да пяці тон. Зразумела, што ўзяць такі «прыборчык» у геалагічную экспедыцыю практычна немагчыма.

У апошнія гады кола задач прыкладнога характару, якія вырашаюцца метадам ЭПР, значна расшырана. У электроннай прамысловасці нядаўна пачалі штучна «вырошчваць» магнітныя плёнкі для ЭВМ. Плёнкі павінны быць ідэальнай чысціні. Сістэма кантролю раней ажыццяўлялася з дапамогай мікраскопа, але такі кантроль недастаткова аб'ектыўны — вочы ў людзей недасканалыя. Цяпер якасць плёнкі вызначае радыёспектрометр. У сельскай гаспадарцы прылада выкарыстоўваецца для даследавання насення на ўсходжасць. Шырока выкарыстоўваецца радыёспектраскапія ў хімічнай вытворчасці, металургіі і іншых галінах.

Выкарыстанне прылады звязана з правядзеннем вялікай колькасці аднатыпных вымярэнняў як у цэхах, лабараторыях, так і ў палявых умовах. Так узнікла неабходнасць стварэння больш кампактнага і транспартабельнага радыёспектрометра. Многія спробы вырашыць гэту задачу і ў нас у краіне, і за мяжой былі беспаспяховымі. Пад сілу задача аказалася групе супрацоўнікаў кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі нашага універсітэта пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі БССР прафесара С. С. Шушкевіча.

Тут па-новаму, нетрадыцыйна падышлі да вырашэння праблемы. Асноўны вузел радыёспектрометра — электрамагніт. Яго і неабходна было паменшыць да мінімуму. Але з памяншэннем памераў памяншаецца таксама велічыня магнітнага поля ў рабочым зазоры, горшымі становяцца параметры прылады. Узнікла ідэя стварыць датчык ЭПР — кампактны малагабарытны блок.

Нямала навуковых і тэхнічных праблем давялося вырашыць, пакуль груваcткая, складаная і дарагая прылада ператварылася ў танную, надзейную і простую ў эксплуатацыі. Бяссонныя ночы, шматлікія рашэнні і гіпотэзы, больш дваццаці вынаходніцтваў... Многія бліскучыя ідэі кандыдата тэхнічных навук У. М. Лінёва, Я. Я. Фурсы, вядучага канструктара універсітэцкага СКТБ з ВВ Б. Я. Кулікоўскіх і іншых маладых супрацоўнікаў знайшлі ўвасабленне ў прыладзе.

Непасрэдны ўдзел у творчых пошуках прымалі студэнты фізфака, распрацоўваючы ў сваіх курсавых і дыпломных праектах асобныя вузлы, блокі і дэталі. У ліку лепшых дыпломных — работы студэнта С. Фядзюнькіна і Ю. Лухвіча. Працуючы побач з вучонымі, яны пераймаюць іх вопыт, вучацца творча думаць.

Сёння ў фізікаў БДУ цэлы шэраг радыёспектрометраў вагой ад 30 да 150 кілаграмаў — чуйных, надзейных, устойлівых да ўздзеяння электрамагнітных выпраменьванняў, вільгаці і іншых неспрыяльных умоў, простых у рабоце, якія маюць аўтаматызаваны працэс наладкі і вымярэнняў.

На выстаўках рознага рангу побач з вялізнымі радыёспектрометрамі вядомых замежных фірм наш «Мінск» выглядае малюткай, хоць не ўступае ім па самых важных параметрах.

У лабараторыі, дзе працуе група С. С. Шушкевіча, — усе пакаленні радыёспектрометраў. Па іх можна прасачыць той нялёгкі шлях, які прайшлі беларускія вучоныя ў пошуках найлепшага варыянту. Асобна ад іншых стаіць апошняя іх работа — малагабарытны уніфікаваны радыёспектрометр «Мінск — Рэм-10». Ён складаецца са спецыяльных модуляў, ці уніфікаваных функцыянальных вузлоў, спалучаючы якія, можна хутка прыстасаваць прыладу да вырашэння канкрэтных задач.

Сёння прылады беларускіх фізікаў паспяхова выкарыстоўваюцца ў геалагічных партыях Заходняй Сібіры і Казахстана, на рудніках Таджыкістана, у навукова - даследчых і вучэбных лабараторыях. І ўсюды вялікі выйгрыш: скарачэнне часу аналізаў, спрашчэнне і павышэнне дакладнасці кантролю. Толькі ў геолагаў кожная такая прылада эканоміць больш за 200 тысяч рублёў у год. А ўсяго ў цяперашні час налічваецца больш дзесяці адрасоў, дзе «прыжыліся» мінскія радыёспектрометры. На стале намесніка загадчыка кафедры па навуковай рабоце Я. Я. Фурсы з кожным днём расце стос пісьмаў, заяў, просьбаў зрабіць радыёспектрометр для той ці іншай мэты. У ім маюць патрэбу вельмі многія галіны і прадпрыемствы нашай краіны.

— Але мы зрабілі сваю справу, — гаворыць Яўген Якаўлевіч. — Зараз слова за канструктарамі і прадпрыемствамі навуковага прыладабу д а в а н н я. Чым хутчэй прамысловасць асвоіць серыйны выпуск новых прылад, тым большы эканамічны эфект атрымае краіна. У нас жа — новыя планы, новыя ідэі.

За распрацоўку, стварэнне і ўкараненне ў народную гаспадарку новага класа радыёспектраметрычнай апаратуры групе маладых беларускіх вучоных у саставе У. М. Лінёва, У. В. Лісоўскага, В. Б. Мачальскага і У. А. Мураўскага, якія ўнеслі асноўны творчы ўклад, прысуджана прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1982 года.

**Т. ЕРМАЛАЕВА,**
**студэнтка журфака.**

## ДА 60-ГОДДЗЯ ЎТВАРЭННЯ СССР

# Казахскі універсітэт

КАЗАХСКІ УНІВЕРСІТЭТ СЁННЯ — цэнтр навукі і культуры рэспублікі. Кожны год ён рыхтуе больш дзвюх тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў па 20 спецыяльнасцях для ўсіх галін народнай гаспадаркі, навукі, культуры і асветы.

А якія ж былі яго першыя крокі?! Як дасягнуў ён сёняшніх поспехаў?

Іх было тады ўсяго 50 чалавек! Яны ў студзені 1934 года выйшлі на свята адкрыцця універсітэта з чырвоным плакатам з палымянымі словамі Маркса і Энгельса: «Кожны, у кім сядзіць Рафаэль, павінен мець магчымасць бесперашкодна развівацца!»

Вялікая мэта нараджала вялікую энергію народа.

Перш за ўсё патрэбны былі кадры прафесарска - выкладчыцкага саставу, абсталяванне і лабараторыі, інтэрнаты для студэнтаў, дапаможнікі і навуковая літаратура, бібліятэка...

Першы рэктар універсітэта Фёдар Трафімавіч Олікаў, аб'яднаўшы вакол сябе маладых выкладчыкаў - энтузіястаў, пачаў сваю рэктарскую дзейнасць. Выкладчыкі былі накіраваны ў Маскву, Ленінград, Кіеў і іншыя універсітэты краіны для запрашэння навукова - педагагічных кадраў, набыцця лабараторнага абсталявання, вучэбнай і навуковай літаратуры. Першыя крокі хутка далі свае вынікі. Прыбылі першыя прафесары і дацэнты, якія прыехалі з розных гарадоў нашай Радзімы.

Малады універсітэт хутка становіцца на ногі, фарміруюцца новыя факультэты: фізіка - матэматычны, біялагічны, хімічны, філалагічны, гістарычны і іншыя.

У хуткім станаўленні універсітэта вялікая роля рускага народа, рускай культуры, бескарысна адданай дзецям учарашніх вандроўнікаў.

Вядомыя рускія вучоныя акадэмік А. Д. Аляксандраў, прафесары І. П. Натансан, У. Л. Ганчароў, У. Л. Кантаровіч, Л. М. Добрацаў, А. А. Гухман, М. П. Стацэнка і іншыя чыталі лекцыі і кіравалі даследаваннямі універсітэта.

Казахскі універсітэт бурна расце і развіваецца. Ён выйшаў у лік перадавых універсітэтаў нашай краіны.

**Калектыўны карэспандэнт — рэдакцыя газеты «КАЗАХСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ».**





У БРАТНЯЙ сям'і народаў СССР расцвіла савецкая Літва. Значных вяршынь дасягнула развіццё навукі і культуры рэспублікі. Сёння тут больш за 10 вышэйшых навучальных устаноў. Вядучае месца сярод ВНУ рэспублікі належыць Вільнюскаму дзяржаўнаму універсітэту імя В. Капсукаса, якому нядаўна споўнілася 400 гадоў. У чатырохвекавой гісторыі Вільнюскага універсітэта савецкі перыяд — параўнальна кароткі, але найбольш значны адрэзак часу. За гэты перыяд універсітэт крочыў наперад асабліва хутка і плённа па ўсіх напрамках навукі і вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Сёння Вільнюскі універсітэт далёка вядомы за межамі сваёй рэспублікі. Ён падтрымлівае рознабаковыя сувязі з большасцю навуковых і навучальных устаноў СССР і зарубежных краін.

**НА ЗДЫМКАХ: новыя карпусы Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта імя В. Капсукаса; чытальная зала універсітэта.**

# «ШЧАСЦЕ МАЁ— ПРАЦА»

...ВЫСОКІ ХУДАРЛЯВЫ чалавек схіліўся над рухавіком аўтобуса. Дужыя рукі хутка перабіраюць патрэбныя інструменты. Вочы ўважлівыя, засяроджаныя. Ён так захоплены працай, што майго паяўлення нават і не прыкмячае. Падыходжу. Павольна падымае галаву і крыху здзіўлена пытае: «Вам чаго?» — і дадае: «Ехаць не магу. Рамонт».

Тлумачу, што пра яго, Мікалая Мікалаевіча Раманава — вадзіцеля універсітэцкага гаража, збіраюся расказаць у газеце.

— А чаго доўга размаўляць? — адказвае. — Праца падабаецца, таму і стараюся. У ёй маё шчасце.

— Не любіць ён пра сябе гаварыць,— тлумачаць таварышы.—А чалавек добры, чулы, працавіты. У бядзе ніколі не пакіне.

— Так, так,— згаджаецца загадчык гаража Міхаіл Пятровіч Шчарбакоў,— Раманаў — адзін з лепшых нашых рабочых. Ветэран працы. Амаль 30 гадоў за «баранкай». Справу ведае. За добрасумленнасць неаднаразова ўзнагароджваўся.

Пра такіх людзей, як Мікалай Мікалаевіч Раманаў, з павагай гавораць: «На іх справа трымаецца». І ў словах гэтых—павага і ўдзячнасць.

**Л. КАМАШКА,**
**студэнтка журфака.**

# ХТО, КАЛІ НЕ Я?

- **ПРА ШТО РАСКАЗАЛІ АНКЕТЫ**
- **ЧЫМ НЕБЯСПЕЧНА БЕСПРАБЛЕМНАСЦЬ!**
- **ТЭМЫ, ЯКІЯ ТУРБУЮЦЬ**
- **ЯК АДКАЗАЦЬ НА «ВЕЧНЫЯ» ПЫТАННІ!**
- **ТАНЦЫ З «ДАДАТКАМ», АБО ПАТРАБУЮЦЦА ЭНТУЗІЯСТЫ**

*Сярод мноства пытанняў, якія ставіць перад намі рэчаіснасць, ёсць і тыя, што звычайна называюцца «вечнымі». Яны ўзнікаюць нечакана, патрабуюць канкрэтнага адказу, прымушаюць зрабіць, магчыма, самае цяжкае і адказнае ў жыцці — выбар. І ўжо сам момант іх нараджэння сведчыць: выхоўваецца асоба. Чалавек шукае сябе. Працэс гэты ідзе ўсё жыццё, але найбольш выразны ён у маладосці. Напэўна таму ў студэнцкія гады адчуваецца асаблівая неабходнасць у шчырай размове, а магчымасць выказаць уласныя думкі і пачуцці цэніцца надзвычай дорага...*

*Чалавек і яго справа. Суадносіны паміж асобай і калектывам. Актыўнае дзеянне і пасіўная сузіральнасць. Прынцыповая крытыка і павярхоўнае крытыканства. Так ці інакш пераламляюцца «вечныя» гэтыя пытанні ў жыцці студэнтаў. Артыкулы «Азбука першакурсніка», «Лагоднасць», змешчаныя на старонках нашай газеты, ужо закранулі некаторыя з гэтых праблем. Сёння гутарка працягваецца. Падставай для яе сталі адказы студэнтаў геаграфічнага, фізічнага і гістарычнага факультэтаў на анкету, прапанаваную рэдакцыяй.*



## 1. КРЫТЫКА ЦІ КРЫТЫКАНСТВА?

«ПРА СВАЕ ЗДОЛЬНАСЦІ чалавек можа даведацца, толькі паспрабаваўшы выкарыстаць іх». Усё часцей у імклівы наш век чуеш пра неверагодныя чалавечыя магчымасці. Таму словы Сенекі Малодшага гучаць зараз вельмі сучасна. Дзейнічай, спрабуй! Толькі праз актыўнае ўспрыманне жыцця даведаешся, чаго ты варты. Здаецца, сёння інакш нельга...

### З АНКЕТ

**— Да каго Вы сябе залічваеце: да «актыву» ці да «пасіву»?**

**— Да «пасіву». Магла быць актыўней, але ж лянота...**

Цікава, што тыя, хто шчыра прызнаецца ва ўласнай пасіўнасці, звычайна аднадушна скардзяцца на нуду, фармалізм і абыякавасць, і амаль ніхто з іх нават і не спрабуе прапанаваць выйсце з гэтага, на іх погляд, надта ж змрочнага становішча. **Калі крытыкуеш — прапануй!** Добра, калі б гэтая формула зрабілася прывычнай для кожнага. Можа, тады б наогул не было патрэбы ў дзяленні на «актыў» і «пасіў», а натуральнае чалавечае імкненне прынесці карысць не гразла б у той дрыгве, якую звычайна называюць «залатой сярэдзінай».

Безумоўна, беспадстаўна разважаць лёгка. Зусім проста адшукаць нейкія гатовыя стэрэатыпныя адказы, нешта накшталт таго, што «трэба быць заўсёды наперадзе», «прымаць удзел у мерапрыемствах»... — і не заўважыць, што скаціўся да шаблону, супраць якога гнеўна выступаў мінуту назад.

### З АНКЕТ

**— Дзе і як ва універсітэце Вы спрабавалі праяўляць сваю самастойнасць?**

**— А навошта яе праяўляць?**

Студэнт гэты лічыць сябе актывістам, у той жа час не забывае паскардзіцца на нуду і, па ўсяму відаць, адносіць займеннік «сам» да тых часцін мовы, якія ўжываюцца даволі рэдка.

Самастойнасць. Іменна яна з'яўляецца тым пробным каменем, на якім высвятляюцца ўсе — і добрыя, і дрэнныя — якасці чалавечага характару. Студэнцкія будаўнічыя атрады, «бульба» — вось дзе, як лічаць студэнты, асабліва ярка яна праяўляецца. І таварыш, якога раней лічылі інертным, адкрываецца новымі, зусім нечаканымі рысамі. Але вельмі цяжка захоўваць, а тым больш праяўляць сваю самастойнасць на працягу ўсяго навучальнага года. Чаму так? Знікае рамантыка? Абставіны ўяўляюцца больш будзённымі? Штодзённыя справы прымушаюць замкнуцца ў сабе? Ці проста знікае пачуццё адказнасці за агульную справу?..

### З АНКЕТ

**— Актыўная жыццёвая пазіцыя. У чым, на Ваш погляд, яна канкрэтна праяўляецца?**

**— Актыўная жыццёвая пазіцыя — гэта калі цябе турбуюць не толькі ўласныя праблемы.**

**— Калі робіш не толькі тое, што ад цябе патрабуюць, а заўсёды крышачку больш...**

Ці патрэбны яшчэ якія-небудзь каментарыі? «Голы» практыцызм, пастаянны разлік: «А што мне за гэта будзе?» — ніколі не прывядуць да добрых вынікаў. Выгляд плённай дзейнасці пры пэўных абставінах стварыць можна, але «рабіць крышачку больш» здолее толькі неабыякавы чалавек.

## 2. «НОУ ПРОБЛЕМЗ»?

ГЭТАЯ АНГЛІЙСКАЯ ФРАЗА літаральна перакладаецца наступным чынам: «Няма праблем». На Захадзе яна служыць своеасаблівым моўным штампам, лёгка злятае з языка, ахвотна ўспрымаецца за чыстую манету. Так зручней:

— Як справы?

— Ноу проблемз! (Маўляў, усё добра, хоць «праблемз» гэтых цэлы воз. Але навошта кожнаму ведаць пра іх, хай лічаць, што ў мяне ўсё ў ажуры).

### З АНКЕТ

**— Пералічыце студэнцкія праблемы, якія Вас турбуюць, пра якія хацелася б пагаварыць.**

**— Нічога не турбуе.**

**— Няма праблем...**

Уздыхнуць з палёгкай? Пляскаць у далоні ад радасці: нарэшце ўсе праблемы вырашаны? Не, не і яшчэ раз не! Хтосьці сказаў, што беспраблемнасць сама па сабе вялікая праблема. Тыя, для каго ўсё добра, або бачаць наваколле ў ружовым свеце (але адзін і той жа колер перашкаджае разнастайнасці, а значыць, і ўдзелу ў сапраўдным жыцці), лічаць за лепшае наогул доўга не разважаць, а ціха пакочвацца сабе па жыццёвых хвалях ды своечасова хавацца ад раптоўных навальніц.

Аналіз анкет падказаў тэму, на першы погляд, нечаканую. Здавалася б, самымі распаўсюджанымі будуць пытанні арганізацыі быту, адпачынку. Яны былі і гучалі дастаткова настойліва, але не яны «пераважылі».

### З АНКЕТ

**— Калі б камсоргам былі Вы, на што звярнулі б асаблівую ўвагу?**

**— На здаровае становішча ў групе.**

І адказ гэты качуе з аркуша ў аркуш, яго без перабольшання можна назваць тыповым. У чым справа? На мой погляд, цікавую думку выказала адна са студэнтак:

— Раз'яднанасць студэнтаў. Прыходзім на заняткі і разыходзімся па дамах, як чужыя. Здаецца, шмат агульных інтарэсаў, але рэдка пашчасціць нават паразмаўляць шчыра. Як з гэтым змагацца — не ведаю. Можа быць, мне ўсё гэта толькі здаецца, і праблемы наогул не існуе? Урэшце ў кожнага шмат сваіх спраў, і як ды з кім іх абмяркоўваць, усе вырашаюць па-свойму...

Стварыць добры мікраклімат у групе. Ці не тая гэта справа, якая павінна не проста турбаваць, а прымусіць дзейнічаць?

## 3. ПРА НЕЎМІРУЧУЮ «ГАЛАЧКУ», КАЗЁННАЕ СЛОВА «МЕРАПРЫЕМСТВА» І ЦІКАВЫЯ ВЕЧАРЫ

ЦУД ТРЭБА РЫХТАВАЦЬ. Нават казачныя чараўнікі не-не, ды схіляліся да гэтай думкі. І тым больш трэба рыхтаваць праграму адпачынку, які заклікаиы не толькі стварыць добры настрой, але і падрыхтаваць глебу для будучай сур'ёзнай працы, вучобы. Гэта даўно ўсім вядома, Амерыкі тут не адкрыеш. Але... Культурна-масавыя ме-ра-пры-ем-ствы чамусьці ў большасці сваёй не вабяць. Наадварот. Адштурхоўваюць.

— Навошта нам кожны раз гэты абавязковы «маральна - выхаваўчы» дадатак да танцаў? — настойліва пытаюць студэнты.

Сапраўды, навошта? Што дрэннага ў тым, калі яны і патанцуюць раз-другі без неабходнай «афіцыйнай часткі»? Упэўнена, што ніякага «крыміналу» тут не будзе. І той жа даклад у іншых абставінах паслухаюць куды ўважлівей, бо не будуць перастунаць з нагі на нагу ў нецярплівым чаканні: «Калі, ну калі ўжо загучыць тая музыка?!» Не трэба чарговай «галачкі», якая ўтульна размесціцца насупраць запланаванага мерапрыемства. Гэта добра вядома. А што трэба? Вось гэтага ўжо, на жаль, і самі студэнты дакладна не ведаюць.

### З АНКЕТ

**— Якія б Вы маглі прапанаваць формы правядзення вольнага часу?**

**— Цікавыя вечары. Дыскатэкі...**

Найбольш распаўсюджаны адказ. Адчуваецца, што ім самім цяжка сказаць, што ж іменна стаіць за прывычным эпітэтам «цікавыя». Кажуць, што самая смачная страва тая, якую сам прыгатаваў. Можа, па аналогіі, самым незвычайным будзе той вечар, які сам падрыхтаваў?..

### З АНКЕТ

**— Што з'явілася для Вас самым цяжкім ва універсітэце?**

**— Я ніколі не магла ўявіць сабе, што моладзь (18—19 гадоў!) можа быць такой пасіўнай у арганізацыі свайго ж вольнага часу! Мне як камсоргу вельмі цяжка было ўзняць актыўнасць студэнтаў нашай групы.**

...І апошняе нелірычнае адступленне. Амаль што ў кожнай анкеце — скаргі на пасіўнасць астатніх. Атрымліваецца, што тыя, хто запаўняў анкеты, гараць жаданнем дзейнічаць, ды вось іншыя перашкаджаюць. Такіх «пакрыўджаных» нямала. Пазіцыя зручная: я, маўляў, не супраць, але ж калектыў нейкі не такі, як трэба, людзі інертныя... А што, калі Іван не стане большківаць на Пятра, а шчыра і проста яны скажуць адзін аднаму: «Хопіць чакаць спадачка з блакітным беражком» і прапануюць — кожны нешта сваё? — Упэўнена, месца знойдзецца і літаратурнаму вечару, і падарожжу на прыроду, і арыгінальнай дыскатэцы. Было б толькі жаданне. Сапраўднае.

Кола студэнцкіх праблем не абмяжоўваецца тымі, якія мы закранулі. Спадзяемся, што размова на гэтым не спыніцца, і пытанні самастойнасці, ініцыятыўнасці, актыўнай жыццёвай пазіцыі студэнтаў знойдуць сваё адлюстраванне ў наступных артыкулах.

**Н. КАЛІШЭВІЧ,**
**наш кар.**

**БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
18 лістапада 1982 г.
Зак. 2010. АТ 15520.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ